# 2022 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.*

Чыгрынаў, І. Плач перапёлкі: раман / Іван Чыгрынаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972. – 312 с.

# 50 гадоў

Раман «Плач перапёлкі» – адзін з самых вядомых твораў Івана Чыгрынава – завершаны ў 1970 годзе. У набор кніга здадзена 30.12.1971, а да друку падпісана 28.04.1972. Выданне мела цвёрдую вокладку, афармленую мастаком Вячаславам Тарасавым. Тыраж склаў 14 000 экзэмпляраў.

Наступнае выданне рамана ў выглядзе асобнай кнігі адбылося ў 1978 годзе (тыраж – 20 000 экзэмпляраў). Пазней на беларускай мове раман перавыдаваўся толькі ў зборніках твораў пісьменніка.

У перакладзе на рускую мову раман «Плач перапёлкі» вялікімі тыражамі выходзіў у многіх рэспубліках СССР. У 1988 годзе раман выдадзены на іспанскай мове (пераклад Карласа Шэрмана).



# «Плач перапёлкі» : 50 гадоў

У рамане «Плач перапёлкі» паказана жыццё вёскі на паўднёвым усходзе Магілёўшчыны на працягу двух першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, калі савецкае войска ўжо адступіла, а немцы яшчэ не прыйшлі. Вынесены ў загаловак твора плач перапёлкі ў тэксце ўзгадваецца на першых жа старонках: журботны і пранізлівы крык птушкі над сваім разбураным гняздом быццам абвяшчае пачатак вайны і блізкае з’яўленне чужынцаў.

Адзін з галоўных герояў твора – Дзяніс Зазыба, сельскі актывіст, які раней ваяваў пад камандаваннем Шчорса, ардэнаносец, намеснік старшыні калгаса. Другі герой твора – старшыня калгаса Радзівон Чубар. Яны пэўны час супрацьстаяць адзін другому: Чубар хоча змагацца з ворагам, шукае шляхі для барацьбы, але яго патрыятызм некалькі спрошчаны, герой робіць адну памылку за другой; Зазыба ж арыентуецца ў няпростых абставінах праз прызму любові да роднай зямлі і веры ў сваіх людзей, у свой народ.


Кп 72-2430
ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

ПЛАЧ ПЕРАПЁЛКІ

РАМАН

ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
МІНСК 1972

# «Плач перапёлкі» : 50 гадоў

Побач з лёсамі Дзяніса Зазыбы і яго сына Масея, Радзівона Чубара пісьменнік прасачыў лёсы многіх іншых персанажаў – паліцэйскага Брава-Жыватоўскага, нямецкага каменданта Гуфельда і яго суайчынніка фон Файта, генерала Зеленагорскага, выкупленага з лагера палоннага Андрэя Марухіна... Чыгрынаў стварыў таксама каларытныя вобразы верамейкаўцаў: вясковых філосафаў Парфёна Вяршкова і Кузьмы Прыбыткова, зайздроснага Сілкі Хрупчыка, нахрапістага Рамана Сёмачкіна, недалёкага Мікіты Драніцы, прыгожай, гордай і нешчаслівай Ганны Карпілавай, негаваркой Марфы Зазыбы, рашучай Палагі Хахловай і іншых.

Як адзначаюць літаратары, несумненнай заслугай Івана Чыгрынава як раманіста з’яўляецца тая гістарычная праўдзівасць, якая захавана пры адлюстраванні падзей і герояў, а таксама атмасферы, у якой яны жылі. У прыватнасці, А. Кудравец пісаў: «…наватарства І. Чыгрынава праявілася ў яго лепшым рамане «Плач перапёлкі», у якім ружовы рамантызм літаратурнай партызаншчыны ...саступіў месца глыбокай бытавой трагедыі народа, кінутага ў пекла вайны...».

# «Плач перапёлкі» : 50 гадоў

Раманам «Плач перапёлкі», выдадзеным у 1972 годзе, Іван Чыгрынаў распачаў 5-кніжны цыкл. Пазней выйшлі раманы: «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужынцы» (1984), «Вяртанне да віны» (1992), «Не ўсе мы згінем» (1996). Усе раманы быццам часткі аднаго вялікага твора, бо ў іх адзіныя героі (як Дзяніс Зазыба і Макар Чубар), а таксама адзіная «лакацыя» – вёска Верамейкі, таму пенталогія іншым разам называецца «верамейкаўскай хронікай». У ёй больш чым на 900 старонках апісаны падзеі ад першых месяцаў акупацыі да партызанскага параду ў Мінску на Савецкай вуліцы, дзе Дзяніс Зазыба смяецца з баявога казла і бачыць здалёк Чарняхоўскага і Панамарэнку.

За напісанне раманаў «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві» Іван Чыгрынаў атрымаў у 1979 годзе Літаратурную прэмію імя Аляксандра Фадзеева.

# «Плач перапёлкі» : 50 гадоў

По матывах рамана «Плач перапёлкі» ў 1990 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм» быў створаны дзевяцісерыйны аднайменны фільм (рэжысёр – Ігар Дабралюбаў), а вядомы беларускі кампазітар Уладзімір Кандрусевіч, натхніўшыся двума творамі, напісаў сімфонію для хора і сімфанічнага аркестра.

Ролі ў фільме выканалі такія вядомыя артысты, як Эдуард Гарачы, Валянцін Белахвосцік, Таццяна Мархель, Аляксей Булдакоў, Павел Дубашынскі, Генадзь Аўсяннікаў і інш.







# «Плач перапёлкі» : 50 гадоў

*Прачытаць раман Івана Чыгрынава можна на сайце беларускай электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка»: https://knihi.com/Janka_Bryl/*

*Аднаіменны фільм можна паглядзець на канале YouTube па спасылцы:*

*https://www.youtube.com/watch?v=YiX76a19n38*